# «ПАТРЭБЕН ВЫНІК! ЛЮДЗІ ЗВЯРНУЛІСЯ — ЗРАБІЦЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Мінчанка таксама ўзняла пытанне асвятлення агульнадамавай плошчы. І днём, і ноччу ў пад'ездзе гарыць святло — так працуюць сучасныя сістэмы асвятлення, якія жыхарам паставілі падчас капрамонту. Аднак людзей гэта, натуральна, не задавальняе: чаму яны павінны пераплачваць за нерацыянальнае выкарыстанне электрычнасці? Акрамя таго, жыхароў хвалюе праблема каналізацыі: яшчэ да капрамонту падвалы рэгулярна падтапляліся, нічога не памянялася і цяпер. Наталля Качанава лічыць заўвагі слушнымі. Мясцовым органам улады даручана вырашыць гэтыя пытанні ў найбліжэйшыя дні.

Рэзюмуючы, Старшыня Савета Рэспублікі нагадала сваю просьбу — стварыць у кожным доме дамавы камітэт або савет, які меў бы прамую сувязь з мясцовымі органамі ўлады. «І не трэба было б хадзіць па інстанцыях: пытанні вырашаліся б імгненна, — патлумачыла спікер. — Ёсць людзі актыўныя, якія гатовы адстойваць інтарэсы іншых. Гэтыя формы і метады работы з людзьмі даўно сябе добра зарэкамендавалі. Дзе так ёсць, там і работа зладжаная. Я ведаю, што гэта дае вынік. Добры вынік».

## Машына-месца ёсць, а карыстацца ім нельга

Іна Васілеўна расказала, што ў 2022 годзе купіла ў Мінску кватэру. У кошт квадратнага метра ўваходзіла і машынамесца ў паркінгу. Аднак калі ключы ад кватэр жыхары шматпавярховіка атрымалі своечасова, то паркінгам карыстацца яны дагэтуль не могуць. Справа ў тым, што дом знаходзіцца на балансе ЖЭСа, які, як патлумачылі жыхарам, не мае права абслугоўваць паркінгі. Заключаць дагавор з таварыствам уласнікаў гаспадары кватэр не хочуць, бо давяраюць дзяржаўнай арганізацыі.

— Колькі ў доме жыхароў? — пацікавілася Наталля Качанава.

— У кожным з двух дамоў — па 118 кватэр, — паведаміла Іна Васілеўна.

— І кожны аплаціў машына-месца ў паркінгу? — удакладніла спікер.

— Так.

Па словах намесніка старшыні Мінгарвыканкама Аляксандра Чэрнікава, на цяперашні момант паркінг нікому не могуць перадаць на абслугоўванне, ён агароджаны, зачынены. «Людзі не зацікаўлены ў стварэнні таварыства ўласнікаў», — дадаў ён. Што датычыцца перадачы паркінга на баланс ЖЭСа, то гэта, як патлумачыў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Рамашка, не прадугледжана заканадаўствам, бо паркінгі не з'яўляюцца іх аб'ектамі. «На жаль, сёння няма механізму прававога налічэння праз рахунак-апавяшчэнне спажыўцам выдаткаў на ўтрыманне менавіта гэтага аб'екта», — удакладніў ён.

— Гэта бязладдзе, што вы дагэтуль не можаце разабрацца з такімі пытаннямі, — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. — Збіраемся, праводзім нарады, экспертныя саветы, на якіх я прашу ўносіць прапановы, якія ідуць ад жыцця, што яшчэ трэба ўрэгуляваць. Усе сядзяць — маўчаць. Як толькі разбіраюцца канкрэтныя пытанні, яны ўсплываюць соты раз. Сёння мы ідзём да таго, што дамы будуць абслугоўвацца ЖКГ. Калі паркінг знаходзіцца каля дома, трэба, каб і яго абслугоўвала ЖКГ, што ўжо даўно павінна было быць унесена ў нарматыўна-прававыя акты. Тады, калі людзі будуюць жыллё і вы абавязваеце іх будаваць паркінгі, трэба ўрэгуляваць пытанне заканадаўча, хто ў далейшым будзе займацца абслугоўваннем гэтых збудаванняў. Людзі не павінны ад гэтага пакутаваць. Гэтае пытанне павінна быць вырашана!»

## Будоўля з наступствамі для іншых

Вячаслаў Алегавіч, які прыехаў на прыём грамадзян з Віцебска, прадстаўляў інтарэсы і свайго суседа — Івана Уладзіміравіча. Ён расказаў, што ў 2022 годзе побач з іх прыватнымі дамамі пачалі ўзводзіць шматпавярховік. У ходзе будаўнічых работ маёмасці гаспадарам двух прыватных дамоў была нанесена шкода. «У нас на сценах пайшлі расколіны, — канкрэтызаваў Вячаслаў Алегавіч. — У суседа перакасіўся гараж. У маім гаражы — расколіны ў сантыметр».

«Вы ўжо кудысьці звярталіся па гэтым пытанні?» — удакладніла Наталля Качанава.

Віцябчанін расказаў, што з просьбай выправіць недахопы яны куды толькі ўжо не звярталіся. «Нам сказалі, што без правядзення незалежнай экспертызы ніякіх работ у нашых дамах праводзіць не будуць, — паведаміў мужчына. — Мы правялі такую экспертызу. У суседа дом застрахаваны, таму страхавая кампанія выплаціла яму грошы. Аднак за гэтыя капейкі, якія яму налічылі, ён нічога не можа зрабіць. Мне ўвогуле сказалі, што ніякай кампенсацыі не будзе».

«Гэта паводле генплана такая забудова каля індывідуальнага жылля?» — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі ў першага намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Анатоля Лінёвіча, які прысутнічаў на прыёме.

«Так, паводле генплана. На гэтым месцы будуюць інтэрнат, ужо ўзведзена шэсць паверхаў», — паведаміў ён. Анатоль Лінёвіч праінфармаваў, што наведаў жыхароў прыватных дамоў, азнаёміўся з праблемай і цяпер разбіраецца, як яе можна вырашыць. «Калі ў перспектыве па генплане ў гэтым месцы прадугледжана шматпавярховая забудова, то будзе разглядацца пытанне аб выдзяленні зямельнага ўчастка для будаўніцтва жылля», — сказаў першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Па словах Наталлі Качанавай, падчас праектавання трэба было ўлічваць, што побач са шматпавярховікам, які плануецца пабудаваць, — не новыя дамы. «Трэба разбірацца, — рэзюмавала спікер. — Уважліва вывучце сітуацыю і прыміце правільнае рашэнне. Дапамажыце людзям!» Адпаведныя даручэнні дадзены Віцебскаму абласному выканаўчаму камітэту.

**Вераніка КАНЮТА.**

# Інфармацыя павінна быць актуальнай

## Дыялог з актывістамі, якія лепш, чым хто, ведаюць праблемы і пытанні мясцовых жыхароў

**На Гомельшчыне прадуктыўнай і папулярнай формай работы раённых дэпутацкіх карпусоў застаюцца дыялогавыя пляцоўкі з актывамі сельсаветаў. У такім фармаце абмяркоўваюцца як актуальныя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, рэгіёна, так і краіны ў цэлым. Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ узначаліла дыялогавую пляцоўку з актывам Лоеўскага раёна. Задаць хвалюючыя пытанні кіраўніку аблсавета змаглі дэпутаты базавага і першаснага ўзроўняў раёна.**



У дыялогавай пляцоўцы ўзялі ўдзел старшыні ўсіх сельсаветаў Лоеўшчыны і актыў Ручаёўскага сельсавета, на базе якога і прайшла сустрэча.

Кацярына Зенкевіч падрабязна расказала пра сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці, знешнеэканамічную дзейнасць у рэгіёне, вытворчасць прамысловай і харчовай прадукцыі, сферу будаўніцтва.

— Трэба разумець, што ад таго, наколькі адказнымі будуць адносіны да працы кожнага на сваім працоўным месцы, залежыць канкурэнтаздольнасць айчынных тавараў і паслуг, а значыць, узровень дабрабыту краіны і людзей, — падкрэсліла старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Кацярына Зенкевіч засяродзіла ўвагу дэпутатаў на выкарыстанні сродкаў абласнога бюджэту для падтрымкі сацыяльнай сферы.

— За кошт гэтых сродкаў стабільна функцыянуюць установы адукацыі, аховы здароўя, культуры, ажыццяўляецца добраўпарадкаванне населеных пунктаў, — нагадала старшыня аблсавета. — Мы павінны больш тлумачыць людзям, колькі дзяржаўных сродкаў укладваецца, каб забяспечыць дастойны ўзровень жыцця, і чаму важны ўклад кожнага чалавека. Любы жыхар можа браць удзел у грамадскім жыцці, асабліва ў навядзенні парадку. Як сказаў Прэзідэнт, Год якасці пачынаецца са свайго двара. Задача ўлады — арганізаваць людзей, стварыць ім умовы, магчымасці для ўдзелу ў добраўпарадкаванні тэрыторый, дзе тыя пражываюць. Да гэтай работы абавязкова павінны падключацца мясцовыя органы ўлады, — падкрэсліла старшыня абласавета і заклікала дэпутатаў да ўзмацнення сумеснай работы з мясцовымі органамі ўлады, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый.

Як было адзначана, сёлета Гомельскі абласны Савет дэпутатаў працягне навучальную і інфармацыйную работу з дэпутатамі базавага ўзроўню. Кацярына Зенкевіч нагадала дэпутатам, што неабходна звярнуць увагу на афармленне інфармацыйнай прасторы ў сельсаветах: стэнды, дошкі аб'яў, сайты. Інфармацыя павінна быць актуальнай. Вядома, неабходна цесна супрацоўнічаць з прадстаўнікамі мясцовых сродкаў масавай інфармацыі, рэгулярна дзяліцца навінамі, у тым ліку аб праведзенай рабоце. Лідар дэпутацкага корпуса Гомельшчыны заклікала працягваць такія важныя формы работы на месцах, як «Дзень дэпутата», «Дзень сельсавета».

— Неабходна рэгулярна праводзіць вучобы дэпутатаў па розных пытаннях, прыцягваць для гэтага вузкіх спецыялістаў. Напрыклад, па зваротах грамадзян — прыцягваць да работы прадстаўнікоў аддзела па зваротах райвыканкама, па распараджэнні маёмасцю — аддзела эканомікі, — зазначыла старшыня абласавета.

Пасля дыялогавай пляцоўкі Кацярына Зенкевіч разам са старшынёй Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў Ірынай Пастуховай і дэпутатам абласавета Тамарай Дземідзенка азнаёмілася з работай аб'ектаў сацыяльна значнай інфраструктуры на тэрыторыі аграгарадка Ручаёўка. Дэпутаты наведалі Ручаёўскую сярэднюю школу імя Мельнікава, дзіцячы садок, сельскую бібліятэку, фельчарска-акушэрскі пункт.

— Сёння на абслугоўванні — больш за 350 чалавек. Вядзём патранаж дзяцей да года, цяжарных жанчын, грамадзян з інваліднасцю. Праводзім дыспансернае назіранне пацыентаў, вакцынацыю. Забяспечваем работу працэдурнага кабінета і аптэкі, — патлумачыла **загадчык Ручаёўскага фельчарска-акушэрскага пункта Яна ГРУШЭНКА**.



На вёсцы сацыяльна значным аб'ектам, безумоўна, застаецца пошта.

— Прыходзяць атрымаць пенсію, аформіць падпіску, аплаціць сотавую сувязь і камунальныя паслугі, набыць тавары штодзённага попыту, — расказала **начальнік мясцовага аддзялення паштовай сувязі Анастасія КАЦУБА**.

Дэпутаты таксама пацікавіліся, як у аграгарадку развіваецца гандаль, і ацанілі асартымент прадукцыі ў краме індывідуальнага прадпрымальніка.

Падчас наведвання кожнага сацыяльна значнага аб'екта дэпутаты цікавіліся, як аказваюцца паслугі з улікам попыту вяскоўцаў.

— У раёне працягваюць праводзіць мэтанакіраваную работу па выкананні сацыяльных стандартаў. Таму на асаблівым кантролі дэпутатаў — даступнасць і своечасовасць паслуг, якія аказваюцца жыхарам сельскіх населеных пунктаў, — адзначыла **старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПАСТУХОВА**.

Па выніках работы ў Лоеўскім раёне Кацярына Зенкевіч у чарговы раз адзначыла ролю дэпутатаў пярвічнага ўзроўню ў рабоце з насельніцтвам на месцы, у вырашэнні пытанняў, якія маюць надзённы характар і хвалююць жыхароў сельскіх населеных пунктаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота газеты «Лоеўскі край».**